з крызісу кіруючыя колы лацінаамерыканскіх краін актывізавалі палітыку дзяржаўнага рэгулявання. У той жа час амерыканскі прэзідэнт Ф. Рузвельт абвясціў у дачыненні да Лацінскай Амерыкі палітыку «добрага суседа», якая азначала адмову ЗША ад інтэрвенцыі ў краіны рэгіёна, гэта значыць ад ранейшай «палітыкі вялікай дубінкі».

1. Што стрымлівала і што садзейнічала мадэрнізацыі сацыяльна-палітычнай і эканамічнай сістэм краін Усходу ў міжваенны перыяд?
2. Вызначце значэнні паняццяў: «мандат», «мандатарый», «падмандатная тэрыторыя». Растлумачце, чаму Д. Лойд Джордж ахарактарызаваў мандатную сістэму наступным чынам: «Мандаты з'яўляюцца проста маскіроўкай для анексій».
3. У міжваенны перыяд многія краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі сталі на шлях мадэрнізацыі. Пакажыце, як адбываўся гэты працэс, на прыкладзе адной з краін.
4. Вызначце асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця краін Лацінскай Амерыкі ў міжваенны перыяд.
5. 1920-я гг. для краін Усходу сталі перыядам актывізацыі нацыянальна-вызваленчага руху. А што адбывалася ў гэты час у заходніх краінах і Савецкай Расіі? Складзіце сінхранічную табліцу.
6. Складзіце табліцу «Нацыянальна-вызваленчы рух у краінах Усходу ў міжваенны перыяд». На чым заснавана агульнасць нацыянальна-вызваленчага руху ў краінах Усходу? Якія фактары абумовілі яго адрозненні?

Чаму адзінай з краін Усходу, дзе адбылася фашызацыя грамадства, стала Японія?

# § 19. Развіццё навукі і культуры ва ўмовах крызісу індустрыяльнага грамадства

**Ключавая ідэя**: у культуры знайшла адлюстраванне эпоха з яе светапоглядам, каштоўнасцямі, навуковымі і тэхнічнымі дасягненнямі.

У першай палове XX ст. заходняя цывілізацыя перажывала сур'ёзныя выпрабаванні. Многія мысліцелі гаварылі пра яе крызіс, які быў звязаны не толькі з навуковым прагрэсам, але і з Першай сусветнай вайной, фашызмам, эканамічным крызісам 1929—1933 гг., каланіяльнымі праблемамі. У той час калі інтэлектуальнае



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

асяроддзе перажывала духоўны крызіс, урбанізаваныя народныя масы індустрыяльных краін патроху адыходзілі ад спадчыны традыцыйнай культуры і пераймалі спажывецкую культуру забаў, прыўнесеную новымі камунікацыйнымі тэхналогіямі. Уступіўшы ў супярэчнасць з навуковым развіццём і эканамічнымі, палітычнымі, сацыяльнымі зменамі, царква вагалася паміж кансерватызмам, які абапіраўся на традыцыі, і жаданнем прыстасавацца да сучаснага свету.

**Навука і культура.** Драматычны вопыт Першай сусветнай вайны і новыя тэхналогіі значна паўплывалі на трансфармацыю як народнай, так і элітарнай культуры. Да вайны радыё выкарыстоўвалася перш за ўсё ў якасці бяздротавага тэлеграфа на караблях. У 1920-я гг. яно ператварылася ў сродак трансляцыі музыкі, навін і рэкламы. Урад ЗША дазволіў стварыць прыватнае радыёвяшчанне. Але ў большасці іншых дзяржаў радыёвяшчанне знаходзілася ва ўласнасці дзяржавы, і новы сродак інфармацыі выкарыстоўваўся ў адукацыйных, культурных і прапагандысцкіх мэтах.

Новыя тэхналогіі ўплывалі на развіццё іншых сродкаў масавай інфармацыі (масмедыя). Тут таксама наперадзе былі ЗША, за якімі ішла Еўропа. Павялічваліся тыражы газет і часопісаў, якія прываблівалі чытачоў сенсацыйнымі загалоўкамі і фотаздымкамі. Маляўнічыя аб’явы ў газетах заклікалі спажыўца набываць новыя тавары. Недарагія грамафоны і патэфоны дазвалялі нават сем’ям з сярэднімі даходамі атрымліваць асалоду ад музыкі ў сваіх дамах, што раней было прывілеяй багатых. Усё больш папулярным станавіўся кінематограф. Джаз, мультыплікацыйныя і гангстарскія фільмы набылі вядомасць на ўсіх кантынентах, што сведчыла пра ўзнікненне глабальнай масавай культуры.

У цэлым жа культура не толькі змянялася пад уплывам тэхнічных дасягненняў, але і трансфармавалася пасля вайны дзякуючы адкрыццям у прыродазнаўчых і сацыяльных навуках. Сярод мноства тэорый і адкрыццяў першых дзесяцігоддзяў XX ст. некаторыя мелі глабальныя вынікі.


NELLIE BLY EXTRA.
The World.
SPORTING EXTRA.
ACROSS THE CONTINENT
EXTRA
WELCOME!

Старонка газеты The New York World. 25 студзеня 1890 г. З 1883 па 1898 г. тыраж газеты ўзрос з 15 тыс. да 1 млн экзэмпляраў. Яе галоўны рэдактар Дж. Пулітцэр стаў родапачынальнікам журналістыкі як прафесіі. Яго імя носіць вышэйшая журналісцкая прэмія ў ЗША

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Часопіс «Аналы», якія выходзіў з 1929 г., паклаў пачатак новаму навуковаму кірунку ў гістарычнай навуцы

Рэвалюцыя ў фізіцы змяніла ўсе старыя ўяўленні аб прыродзе. Выявілася, што атам не з'яўляецца апошняй непадзельнай часцінкай матэрыі, паколькі складаецца з яшчэ больш дробных часцінак. *М. Планк* адкрыў, што святло і энергія не ўтвараюць безупынны паток, а выпраменьваюцца ў выглядзе нейтральных элементарных часцінак — квантаў. Агульная тэорыя адноснасці *А. Эйнштэйна* паставіла пад сумненне непахіснасць ньютанаўскай фізікі. Згодна з яго тэорыяй час, прастора і маса з'яўляюцца не фіксаванымі, а адноснымі велічынямі. Людзям, далёкім ад навукі, гэта здавалася пазбаўленым усялякага сэнсу. Тым не менш фізікі абяцалі адкрыць многія таямніцы прыроды і забяспечыць людзей новымі крыніцамі энергіі.

Вынікі даследаванняў у сацыяльных навуках былі больш уражальнымі, чым у новай фізіцы, паколькі яны кінулі выклік віктарыянскай маралі, буржуазным каштоўнасцям і нават самой ідэі заходнееўрапейскай перавагі. Аўстрыйскі псіхіятр *З. Фрэйд* стварыў тэорыю і тэхніку псіхааналізу. Ён выявіў у чалавечай свядомасці не толькі рацыянальны пачатак, але таксама схаваныя пласты эмоцый і жаданняў, прыглушаных сацыяльнымі абмежаваннямі. Фрэйд пісаў: «Прымітыўныя, дзікія і злосныя імпульсы не зніклі з індывідуума, але працягваюць сваё існаванне, хаця і ў прыглушаным стане». Тым часам сацыёлагі, антраполагі пачалі эмпірычнае вывучэнне грамадстваў, як заходніх, так і незаходніх. Яшчэ напярэдадні вайны французскі сацыёлаг *Э. Дзюркгейм* прыйшоў да сенсацыйнай тады высновы, што «няма фальшывых рэлігій, усе яны правільныя па-свойму».



Фізікі, лаўрэаты Нобелеўскай прэміі В. Нернст, А. Эйнштэйн, М. Планк, Р. Эндрус, М. Лаўэ. 1928 г.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Хаця гэтыя ідэі былі выказаны да 1914 г., менавіта досвед Першай сусветнай вайны шмат у чым пацвердзіў іх справядлівасць, паставіўшы пад сумненне веру еўрапейцаў у розум і прагрэс. Калі словы «прымітыўны» і «дзікі» прыдатныя да еўрапейцаў у роўнай ступені, як і да іншых народаў, і калі ўсе рэлігіі ў роўнай ступені правільныя, то што ж застаецца ў выніку ад перавагі заходняй цывілізацыі? Новы падыход да вывучэння чалавечага грамадства быў названы культурным рэлятывізмам па аналогіі з паняццем «адноснасць» у фізічным свеце. Адны прынялі новыя ідэі з энтузіязмам, іншыя асудзілі і адхілілі іх. Самаўпэўненае ўспрыняцце парадку і прагрэсу, характэрнае для еўрапейскай і амерыканскай культуры, пахіснулася.

**Супярэчлівы характар развіцця навукі.** Ва ўмовах перыядычнага абвастрэння міжнароднай палітыкі многія навуковыя адкрыцці і вынаходніцтвы ўсё часцей выкарыстоўваліся ў ваенных мэтах. З'явіліся новыя віды ўзбраенняў і ваеннай тэхнікі, у тым ліку танкі і самалёты, падводныя лодкі і караблі-браняносцы. Сур'ёзныя поспехі, дасягнутыя ў 1920—1930-я гг. у сферы ядзернай фізікі, максімальна наблізілі навукоўцаў да атрымання атамнай энергіі. Крыху пазней вучоныя змаглі стварыць атамную бомбу.

Такім чынам, развіццё сучаснай навукі і тэхнікі ад самага пачатку набывала супярэчлівы характар. З аднаго боку, яно садзейнічала прагрэсу і вяло да рэзкага паляпшэння жыцця і побыту людзей, а з іншага — рабіла ўсё больш масавымі і разбуральнымі сродкі знішчэння. Гэтая тэндэнцыя праявілася ўжо ў час Першай сусветнай вайны.

**Літаратура і мастацтва.** Менавіта навуковы прагрэс, а таксама войны і рэвалюцыі разбурылі грамадскія традыцыі і паставілі пад сумненне ранейшую сістэму каштоўнасцей. Людзі, усё больш вызваляючыся ад маральных і грамадскіх прымусаў і забарон, звярталіся да падсвядомасці і прыродных інстынктаў, свету сваіх сноў, унутраных сіл, якія кіравалі іх учынкамі. Гэты супярэчлівы рацыяналізму кірунак у культуры зарадзіўся яшчэ ў канцы XIX ст., у поўнай жа меры ён праявіў сябе ў сферы мастацтва пасля Першай сусветнай вайны. Вынікам канфлікту рацыянальнага і ірацыянальнага ў культуры стала разнастайнасць літаратурных жанраў.

Паколькі розныя віды мастацтва ўзаемадзейнічалі паміж сабой і па-рознаму інтэрпрэтаваліся, у розных краінах свету і галінах культуры праявілася мноства мастацкіх школ і кірункаў. Разнастайнасць стыляў і метадаў, якія адышлі ад класічных прыёмаў мастацкай творчасці, атрымала назву ***мадэрнізм***.

*Экспрэсіянізм*, які ўзнік у Германіі пасля Першай сусветнай вайны, знайшоў адлюстраванне спачатку ў жывапісе, затым у пластычным мастацтве, а таксама ў літаратуры, музыцы і кінематографе. Творы экспрэсіяністаў прасякнуты песімістычным бачаннем свету, напоўнены пачуццямі трывогі і страху, безвыходнасці і тугі, глыбокай незадаволенасцю навакольнай рэальнасцю.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Футурызм*, які ўзнік у Італіі ў 1909 г., усхваляў рух, тэмп, хуткасць і знайшоў сваё адлюстраванне ў літаратуры, жывапісе, скульптуры і архітэктуры.

Свой скептыцызм альбо сумненне ў значнасці традыцыйных грамадскіх каштоўнасцей выказвалі буйныя дзеячы культуры, якія не адносілі сябе да якіх-небудзь кірункаў альбо школ, — напрыклад, нямецкі філосаф і гісторык *О. Шпенглер*, італьянскі пісьменнік *Л. Пірандэла*, аўстрыйскі пісьменнік *Ф. Кафка* і інш. У процівагу філасофіі рацыяналізму з'явілася рэлігійная (*М. дэ Унамуна, Ф. Марыяк*) і ірацыянальная філасофія, якая адмаўляла альбо абмяжоўвала ролю розуму ў спасціжэнні свету. У мастацтве ірацыяналізм праявіўся ў такіх кірунках, як дадаізм і сюррэалізм.

Адыход ад рэальнага свету прыводзіў да суб'ектывізму *(М. Пруст, Дж. Джойс)*, эстэтычных пошукаў *(П. Валеры)* альбо да нейкай разнавіднасці класіцызму *(Ж. Жыраду)*. Яркім выразнікам сюррэалізму ў жывапісе быў іспанскі мастак *С. Далі*.

Супрацьпастаўляючы сябе тым, хто адыходзіў ад рэальнасці, многія іншыя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі прымалі актыўны ўдзел у сучасных падзеях. У той час калі ў Італіі футурызм з'яўляўся адным са складнікаў фашысцкай ідэалогіі, у Францыі ў 1925—1934 гг. сюррэалізм быў ідэйна блізкі партыі камуністаў. У СССР пісьменнікі, дзеячы мастацтваў сталі служыць рэвалюцыі, дапамагалі будаваць новае сацыялістычнае грамадства. У Германіі пасля дабратворнага для культуры перыяду Веймарскай рэспублікі да ўлады прыйшлі нацысты, якія выслалі з краіны многіх пісьменнікаў, мастакоў, іншых дзеячаў мастацтва,



Жанчына ў капелюшы. Мастак *А. Маціс*. 1905 г. Фавізм



Дамы ў Эстаку. Мастак *Ж. Брак*. 1908 г. Кубізм



Патсдамская плошча ў Берліне. Мастак *Э. Л. Кірхнер*. 1914 г. Экспрэсіянізм



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

што прэтэндавалі на захаванне за сабой творчай свабоды. Апошнія не толькі пазбаўляліся права ствараць, але і нярэдка знішчаліся фізічна. Грамадзянская вайна ў Іспаніі выклікала ўмацаванне палітычнага ўплыву інтэлігенцыі ва ўсім свеце. У канцы 1930-х гг. *Дж. Стэйнбек, Э. Хемінгуэй, Л. Арагон* сталі франтавымі карэспандэнтамі і прымалі ўдзел у ваенных дзеяннях.

Уплыў кубізму, футурызму, экспрэсіянізму, выкарыстанне новых матэрыялаў (цэмент), а галоўнае — новыя ўмовы жыцця, звязаныя з развіццём індустрыяльнай цывілізацыі, адбіліся на архітэктуры XX ст. Хаця яшчэ працягваў існаваць манументальны стыль, натхнёны неакласіцызмам альбо неаготыкай (напрыклад, царква Святога сямейства А. Гаўдзі ў Барселоне), паскарэнне тэмпаў урбанізацыі запатрабавала ад архітэктуры функцыянальнасці і ўзвядзення вышынных будынкаў. Створаны *В. Гропіусам* у Веймары архітэктурны кірунак *баўхаўз* актыўна ўключыў элементы пластычнага мастацтва (упрыгажэнне, мэбліроўку) у архітэктуру, каб зрабіць яе больш функцыянальнай і адначасова эстэтычнай. Развіваючы новую канцэпцыю жылля з выкарыстаннем новых тэхналогій, швейцарскі архітэктар *Ш. Э. Ле Карбюзье* таксама прыняў да ўвагі ўрбанізм і неабходнасць узвядзення шматкватэрных будынкаў. Ён працягнуў сваю працу і пасля Другой сусветнай вайны. У пэўным сэнсе архітэктура ператварылася ў адзін з найбольш дэмакратычных відаў мастацтва: квіткі ў мастацкія галерэі і тэатры, на канцэрты, а таксама кнігі каштавалі грошай, а творы архітэктуры былі даступныя для агляду любому ахвотніку. Такім чынам, былі закладзены асновы новага кірунку ў архітэктуры — ***функцыяналізму***.



Лесаруб.
Мастак *К. Малевіч*.
1912 г. Футурызм



Імправізацыя 31
(Марскі бой).
Мастак *В. Кандзінскі*.
1913 г. Абстракцыянізм



Увесь першы чысты свет.
Мастак *М. Эрнст*.
1923 г. Сюррэалізм



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Д. У. Грыфіт, М. Пікфард, Ч. Чаплін, Д. Фэрбенкс падпісваюць пагадненне аб стварэнні кінакампаніі United Artists. 1919 г.

У музыцы смелыя і наватарскія творы *І. Стравінскага*, *А. Шонберга* і іншых адлюстроўвалі разрыў з традыцыяй, са спадчынай Р. Вагнера, К. Дэбюсі. Але вялікай музычнай рэвалюцыяй першай паловы XX ст. лічыцца з'яўленне і развіццё *джаза*, які зарадзіўся ў Амерыцы.

Агульнапрызнанай народнай забавай пасля стварэння першых фільмаў братамі *А.* і *Л. Люм'ер* стала кіно. Да Першай сусветнай вайны ў кінематографе дамінавала Францыя, затым — Галівуд у ЗША з яго вестэрнамі і кінакамедыямі нямога кіно *(М. Сенет, Б. Кітан)*. У 1920-я гг. у Еўропе ўзніклі дзве кінематаграфічныя школы — нямецкая *(Ф. Ланг)* і савецкая *(С. Эйзенштэйн і У. Пудоўкін)*. Нягледзячы на тое што ў Еўропе з'явіліся такія вядомыя рэжысёры, як *Ж. Рэнуар* і *М. Карнэ*, Амерыка захавала сусветнае лідарства ў кінавытворчасці.

Кіно, якое ўключала ў сябе элементы розных відаў мастацтва — літаратуры і тэатра, жывапісу і музыкі, — паступова станавілася магутным сродкам уздзеяння на свядомасць і псіхіку людзей.



Кадр з фільма «Браняносец „Пацёмкін“». Рэжысёр *С. Эйзенштэйн*. 1925 г.
Фільм зрабіў вялізны ўплыў на сусветны кінематограф і не адзін раз прызнаваўся лепшым фільмам усіх часоў і народаў



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Якія змены ў светапоглядзе, побыце і ладзе жыцця людзей адбыліся ў перыяд станаўлення індустрыяльнага грамадства ў першай палове XX ст.?
2. Ці існуе сувязь паміж філасофіяй, навукай і мастацтвам першай паловы XX ст.? У чым яна праяўлялася?
3. Якія новаўвядзенні з'явіліся ў архітэктуры ў першай палове XX ст.? Хто з архітэктараў зрабіў значны ўплыў на сусветнае горадабудаўніцтва?
4. Назавіце вядомых вам рэжысёраў і акцёраў 1920—1930-х гг. Якія фільмы гэтага перыяду вы бачылі? Апішыце свае ўражанні.
5. Ахарактарызуйце творчасць аднаго з дзеячаў мастацтва міжваеннага перыяду (на ваш выбар).
6. Сістэматызуйце інфармацыю аб развіцці навукі і культуры ў міжваенны перыяд. Даныя афарміце ў табліцу.

7. З чым звязана з'яўленне вялікай колькасці мастацкіх кірункаў і плыняў у пачатку XX ст.?

Звярніце ўвагу на такую супярэчнасць: дасягненні навукі і тэхнікі выкарыстоўваюцца для стварэння зброі масавага знішчэння, а мастацтва накіроўвае свае намаганні на папярэджанне людзей аб небяспецы і жахах новай вайны. Чым вы можаце гэта патлумачыць?

**З працы расійскага мастацтвазнаўцы В. Г. Уласава «Стылі ў мастацтве» (1995)**

Развіццё ў мастацтве існуе як пэўнае назапашванне мастацкага досведу і ўскладненне аналітычных працэсаў мастацкага мыслення. Кожны гістарычны мастацкі стыль унікальны і прынцыпова непаўторны. Ён з'яўляецца ў патрэбны час у пэўным месцы. Даўно заўважана, што жалезная сякера зроблена не лепш за каменную. Проста матэрыялы розныя. Так і ў гісторыі мастацкага мыслення. Новыя кірункі і стылі ў мастацтве не больш дасканалыя за старыя, яны толькі інакш адпавядаюць змененаму зместу. Кожны стыль на пэўным этапе гістарычнага развіцця ў поўнай меры вычэрпвае свае ўнутраныя магчымасці. Прагрэс, калі гэты тэрмін можа быць увогуле тут прыдатны, адносіцца не да мастацтва, а да таго свету, у якім яно існуе.

*Растлумачце, як мастацтва адлюстравала дасягненні і супярэчнасці XIX — пачатку XX ст.*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# § 20. Свет на шляху да новай сусветнай вайны

**Ключавая ідэя**: палітыка «прымірэння» агрэсара прывяла да радыкальнага змянення балансу сіл у Еўропе, аслаблення геапалітычных пазіцый Вялікабрытаніі і Францыі. Вайна стала непазбежнай.

Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін, створаная пасля Першай сусветнай вайны, задавальняла многія краіны, акрамя Германіі, Японіі і Італіі. Гэтыя тры дзяржавы ў далейшым і стварылі ачагі новай сусветнай вайны. З усталяваннем таталітарных рэжымаў у Італіі, а затым і ў Германіі ўсё больш выразна абазначаліся іх агрэсіўныя памкненні. Фашысцкія ўрады гэтых краін ставілі сваёй мэтай перагледзець Версальскі і іншыя мірныя дагаворы і стварыць «новы сусветны парадак». Ліга Нацый, у статуце якой былі прадугледжаны і калектыўныя меры супраць агрэсара для вырашэння канфліктных сітуацый, на жаль, не змагла забяспечыць жаданай стабільнасці ў Еўропе.

**Крах Версальскай сістэмы.** Як толькі ў Германіі ўсталяваўся агрэсіўны нацыянал-сацыялістычны рэжым, яго канчатковай мэтай было абвешчана заваяванне «жыццёвай прасторы» для нямецкай нацыі. Гітлер амаль адразу прыступіў да стварэння рэгулярных узброеных сіл і стаў правяраць рэакцыю астатніх дзяржаў пры дапамозе серыі нечаканых акцый, якія суправаджаліся абавязковымі запэўненнямі аб міры.

У кастрычніку *1933 г.* Германія выйшла з Лігі Нацый. Францыя і Вялікабрытанія асудзілі гэтую акцыю, але так і не вырашылі, якія меры супрацьдзеяння прыняць — блакаду альбо ўварванне. Пазней Гітлер абвясціў, што Германія ўводзіць усеагульную воінскую павіннасць, аднаўляе сваю армію і стварае ваенна-паветраныя сілы ў парушэнне Версальскага дагавора. Замест пратэсту Вялікабрытанія падпісала ваенна-марское пагадненне з Германіяй, таму што яна, як і Францыя, баялася магчымай вайны ў выпадку рознагалоссяў з Германіяй.

ЗША, у той час занятыя ўнутранымі эканамічнымі праблемамі, вярнуліся да ізаляцыянізму і перасталі ўмешвацца ў справы Еўропы.



Падпісанне Германіяй і Японіяй Антыкамінтэрнаўскага пакта. 25 лістапада 1936 г.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ